**А. Г. Цымбал**

# МЕСЦЫ ПАМЯЦІ: СУЧАСНЫЯ ПАДЫХОДЫ ДА ІНТЭРПРЭТАЦЫІ

З моманту заканчэння Другой сусветнай вайны адбыліся сур'ёзныя змены ў падыходах да канцэпцыі спадчыны, інтэрпрэтацыя якой сёння звязана з паняццем «месцаў памяці». Тэрмін спадчына выкарыстоўваецца для апісання падыходу да мінулага, які захоўвае, інтэрпрэтуе і прадстаўляе сведчанні мінулага для вывучэння і асветы грамадскасці, у тым ліку турыстаў, а таксама мясцовых супольнасцяў. Дадзены падыход прыводзіць да больш глыбокага і збалансаванага разумення мінулага.

Канцэпт «месцаў памяці» быў вызначаны французкім гісторыкам П'ерам Нара. Месца памяці – гэта любая значная сутнасць, матэрыяльная або нематэрыяльная па сваёй прыродзе, якае па волі чалавека або па волі часу стала сімвалічным элементам мемарыяльнай спадчыны любой супольнасці. Месцы памяці – гэта месцы, якія ў сувязі з характарам падзей, якія там адбываліся, маюць гістарычнае, сацыяльнае або культурнае значэнне. Яны могуць мець асаблівае значэнне, улічваючы іх ролю ў фарміраванні ідэнтычнасці супольнасці або нацыі. Месцы памяці, на яго думку, уключаюць такія месцы, як музеі, саборы, мячэці, храмы, палацы, могілкі, архівы і мемарыялы, канцэпты і практыкі, камемарацыі, дэвізы і рытуалы; аб'екты, як эмблемы, асноўныя тэксты і сімвалы важныя для сацыяльнай групы.

У цяперашні час спадчына прызнана міжнароднай навуковай супольнасцю, міжнароднымі і нацыянальнымі ўрадавымі органамі ў якасці важнага фактару самабытнасці супольнасцей і груп, уключана ў мэты Арганізацыі Аб'яднаных Нацый у галіне ўстойлівага развіцця на перыяд да 2030 года.

Гэта прызнанне звязана з развіццём і зменамі ва ўспрыманні гісторыі, праз такія новыя падыходы як “shared historical authority” і “co-created histories”. Акрамя таго, аб'екты культурнай спадчыны ўсё часцей разглядаюцца як важны ўклад ва ўстойлівы рост, развіццё турызму, сацыяльны і эканамічны дабрабыт мясцовых супольнасцяў, а таксама ў іх пачуццё ідэнтычнасці.

Адным з следстваў пашырэння новага разумення спадчыны з’яўляецца значна больш ўсёабдымны і цэласны падыход да кіравання сведчаннямі мінулага, часта заснаваны на канцэпцыях культурных ландшафтаў і гістарычных гарадскіх ландшафтаў.

Сучасны падыход да месцаў памяці як спадчыны грунтуецца на кашоўнасцях, якія падзяляюць людзі. Паколькі розныя групы могуць успрымаць розныя і нават супярэчлівыя каштоўнасці ў адным і тым жа месцы, усе гэтыя групы, а не толькі спецыялісты па спадчыне, павінны ўдзельнічаць у прыняцці рашэнняў аб тым, што адбываецца з гэтымі месцамі.

Прызнанне разнастайнасці зацікаўленых бакоў і іх часта супрацьлеглага разумення каштоўнасці аб'ектаў спадчыны прывяло да зменаў у падыходах да інтэрпрэтацыі шляхам прызнання, што месцы памяці могуць мець розныя значэнні для розных супольнасцяў, кожная са сваім уласным наратывам, які ў многіх выпадках можа супярэчыць адзін аднаму. У цяперашні час усё часцей прызнаецца, што інтэрпрэтацыя большасці аб’ектаў культурнай спадчыны павінна ўключаць у сябе мноства наратываў і пунктаў гледжання.

На міжнародным узроўні прызнанне і інтэрпрэтацыя аб’екта з мемарыяльнымі аспектамі павінны ажыццяўляцца з асаблівай павагай да пачуццяў іншых краін і іншых супольнасцей, а таксама ў духу супрацоўніцтва, які ляжыць у аснове канцэпцыі ЮНЕСКА і Канвенцыі аб сусветнай спадчыне. Для ўсіх месцаў памяці, будзь то лакальныя, нацыянальныя, рэгіянальныя або міжнародныя, інтэрпрэтацыя павінна быць этычнай і адпавядаць каштоўнасцям месца і яго сапраўднасці. Нарытыў месца памяці быць сумленным, справядлівым і непрадузятым і, магчыма, павінен ўключаць некалькі розных поглядаў. Для дасягнення гэтай мэты часта бывае карысны знешняя экспертыза падыходу да інтэрпрэтацыі. Таксама важна пазбягаць анахранічнага ўвядзення сучасных ідэй, ідэалагічных штампаў і перспектыў сучаснасці ў апісанні мінулага і прадстаўляць мінулыя падзеі ў іх кантэксце. Прэзентызм з’яўляецца недапушчальным ў інтэрпрэтацыі месцаў памяці.

На міжнародным узроўні інтэрпрэтацыя месцаў памяці павінна забяспечваць культурныя правы. Спадчына важная як права і адыгрывае вялікую ролю ў фарміраванні ідэнтычнасці, асабліва мясцовых жыхароў і іншых значных супольнасцяў.

Пры працы з месцамі памяці прадугледжваецца забяспячэнне і інклюзіўнага падыходу праз ілюстрацыю ўспрымання ў цяперашні час значнасці, і асацыятыўных каштоўнасцей месца памяці з ўлікам меркавання супольнасцей, так ці інакш звязаных з месцам, паколькі часта грамадскасць фактычна піша гісторыю месца памяці.

Сацыяльны аспект адлюстроўваецца праз прыцягненне увагі да сацыяльных, эканамічных і экалагічных аспектаў аб'екта спадчыны.

Звяртаецца ўвага на пытанні захавання і рэстаўрацыі, а таксама да прыярытызацыі мерапрыемстваў па захаванні ў дачыненні да мемарыяльных аспектаў.

Інтэрпрэтацыя месцаў памяці павінна адпавядаць асноўным мэтам ЮНЕСКА і духу Канвенцыі аб сусветнай спадчыне 1972 года, рэкамендацыі 1972 г. аб ахове культурнай і прыроднай спадчыны на нацыянальным узроўні і прынцыпам палітыкі Камітэта сусветнай спадчыны па інтэграцыі перспектывы ўстойлівага развіцця ў працэсы Канвенцыі аб сусветнай спадчыне, якія дастасуюцца да ўсіх месцаў памяці: дыялог, паразуменне, памяркоўнасць, павага.

Пры інтэрпрэтацыі месца памяці таксама неабходна:

вызначэнне каштоўнасцей, што прадугледжвае ідэнтыфікацыю асацыятыўных каштоўнасцей мемарыяла як часткі агульнай ацэнкі значнасці месца памяці з прыцягненнем усіх зацікаўленых бакоў, уключаючы іх супярэчнасці ў інтэрпрэтацыі. Інтэрпрэтацыя павінна перадаць шматграннае значэнне і каштоўнасці месца памяці і прадбачыць магчымыя змены ў значэннях і інтэрпрэтацыі месца памяці з цягам часу.

Прымірэнне розных кропак гледжання, што значыць кіраванне рознымі, часам разбежнымі, супярэчлівымі і канфліктуючымі каштоўнасцямі, якія ўзнікаюць у выніку адрозненняў ва ўспрыманні зацікаўленымі бакамі каштоўнасцяў месца памяці. Магчыма, спатрэбіцца прадставіць больш аднаго гістарычнага наратыву аб месцы памяці. Выкарыстоўваць інтэрпрэтацыю для пераадолення рознагалоссяў, забеспячэння платформы для годнасці і павагі да ўсяго вопыту, пазбягаючы або зводзячы да мінімуму палітычную эксплуатацыю. гэта можа прывесці да развіцця пазітыўнай перспектывы з пункту гледжання аднаўлення грамадства і грамадскіх адносін. Інтэграваць прымірэнне і нават прабачэнне ў інтэрпрэтацыю месцаў памяці.

Інтэрпрэтацыя павінна ўключыць матэрыяльныя доказы, уключаючы архівы або вусныя сведчанні, сімвалічным чынам упісаныя ў наратыў месцаў памяці.

Сучасныя падыходы да пазнання гісторыі прызнаюць, што любы наратыў месца памяці з’яўляецца інтэрпрэтацыяй вядомых фактаў і доказаў, і такой рэчы, як абсалютная ісціна, не існуе. Таму навукоўцы і іншыя зацікаўленыя бакі, уключаючы ўсе супольнасці, што маюць адносіны да месца памяці могуць злічыць карысным працу ў рамках канцэпцыі «чатырох ісцін» Міжнароднай кааліцыі месцаў сумлення. Канцэпцыя прадугледжвае аналіз месцаў памяці і месцаў сумлення праз некалькі відаў «праўды»:

афіцыйная праўда – публічнае і афіцыйнае прызнанне або адмаўленне таго, што адбылося;

наратыўная праўда – апавяданні ахвяр, сведак і злачынцаў;

сацыяльная праўда – усталёўваецца з дапамогай грамадскага ўзаемадзеяння паміж усімі зацікаўленымі бакамі;

праўда, якая лякуе – праўда, якая дапамагае выправіць шкоду і прадухіляе паўтарэнне грамадзянскага гвалту.

Мемарыяльны аспект аб'ектаў спадчыны існуе даўно, але ў апошнія дзесяцігоддзі ён стаў больш выразна акцэнтавацца праз прызнанне катэгорыі аб'ектаў памяці. Прызнанне месцаў памяці і месцаў сумлення з іх арыентацыяй на будучыню на вылячэнне мінулых траўмаў з’явілася адносна нядаўна. Калі некаторыя аб'екты спадчыны маюць значнасць у першую чаргу з-за іх мемарыяльных аспектаў, ёсць шмат іншых, якія, тым не менш, маюць мемарыяльныя аспекты, якія неабходна ўлічваць пры іх інтэрпрэтацыі.

Любое месца памяці можа выклікаць дыскусіі і спрэчкі з-за супярэчлівых ацэнак і каштоўнасцей тых, хто мае дачыненне да яго, і патрабуе ўважлівай інтэрпрэтацыі такіх розных поглядаў. Гэтая інтэрпрэтацыя павінна быць інклюзіўнай і закранаць усе адчувальныя моманты, звязаныя з пэўным месцам памяці.